# Апавяданне Янкі Брыля “Memento mori”: музейны ўрок

Урок беларускай літаратуры ў 9 класе

**С. І. Пакуць,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 7 г. Ваўкавыска

**Мэта:** дапамагчы вучням пашырыць веды пра жыццё і творчую дзейнасцю Я.Брыля,зразумець ідэйна-мастацкі і філасофскі змест апавядання “Memento mori”,спрыяць асэнсаванню маральнага подзвігу чалавека ў гады Вялікай Айчыннай вайны і вартасці чалавечага жыцця ў наш час.

**Задачы:**

1)стварыць умовы для пашырэння ведаў вучняў аб творчасці Я.Брыля, аб маральным подзвігу і высакароднасці старога печніка ў апавяданні;

2)садзейнічаць удасканаленню навыкаў аналізу апавядання і яго вобразаў, праблематыкі твора;

3)спрыяць выхаванню павагі да подзвігу людзей у гады вайны, пачуцця беражлівых адносін да памяці яе ахвяр,асэнсаванню сэнсу чалавечага жыцця ў наш час.

**Абсталяванне:** музейная экспазіцыя, прысвечаная памяці ахвяр в.Шавулічы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны ( фотаздымкі в. Шавулічы), партрэт Я.Брыля, выстава яго кніг.

**Урок-даследаванне.**

**Метад часткова-пошукавы.**

**Формы працы**: індывідуальная, групавая, калектыўная.

**Эпіграфы:** **1.**“Быць чалавекам – цяжкае прызванне,не ўсім,не кожнаму ўтрымаць яго”.

Т.Бондар

**2.** Я вас прашу, не зведаў хто вайны,

Прашу вас, мае дочкі і сыны,
Узяць хоць долю памяці маёй,
Каб потым ёй не зарасці травой.

А.Вярцінскі

## Ход урока

**1.Эмацыянальна-арганізацыйны этап**

**а)слова настаўніка:**

Паважаныя дзевяцікласнікі, я рада вітаць вас сёння ў нашым школьным музеі напярэдадні вялікага свята – 76-годдзя Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.Як вы лічыце: чаму наш урок праходзіць менавіта тут?(Адказы вучняў).Хочацца вельмі спадзявацца на тое,што наша сустрэча будзе для вас карыснай і прымусіць задумацца не толькі аб гістарычных падзеях,якія мы будзем сёння ўспамінаць, але і аб уласным жыцці.А зараз прапаную вам звярнуць увагу на музейную экспазіцыю.

(Слуханне ўрыўка сімфанічный паэмы Г. Вагнера “Вечна жывыя”, разгляд фотаздымкаў спаленай вёскі Шавулічы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці).







**б) калектыўная гутарка з класам :**

Ці прыходзілася вам бываць у гэтых мясцінах? Што вы пра іх ведаеце?(Адказы вучняў або вуснае паведамленне вучня-экскурсавода пра вёску Шавулічы )

Вёска Шавулічы…Да вайны гэта была вяікая, прыгожая вёска з драўлянамі хатамі. Вуліца ў ёй была вымашчана каменнем, жыхары для навучання сваіх дзяцей будавалі двухпавярховую школу, меўся магазін. Жылі людзі ў вёсцы дружна, весела, было шмат моладзі, маленькіх дзяцей.

Раніцай 7 ліпеня 1943г. фашысты пачалі расправу над жыхарамі вёскі Шавулічы за сяброўства з партызанамі. Гэта было як пакаранне за забойства партызанамі нямецкага доктара гаупмана Мазура.

Калі ўсё было закончана, фашысты падпалілі хаты. Ахвярамі сталі 366 вяскоўцаў, 120 з якіх дзеці, спалена было 77 двароў, знішчана 94 сям’і.

**2.Падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу**

**а) слова настаўніка з элементамі гутаркі :**

Са старажытных часоў чалавецтва знаёма з лацінскім выразам “Memento mori” (памятай пра смерць).

1) Што ён абазначае ? Ці часта людзі задумваюцца пра гэта ?

2) Ці маглі задумвацца ворагі, якія гэта ўчынілі, якой можа аказацца для іх смерць?( Адказы вучняў)

**б) работа з эпіграфамі да ўрока:**

1)Растлумачце сэнс выказвання Т.Бондар. Чаму,на думку паэткі,быць чалавекам цяжка? Ці можна ў наш час чалавечнасць лічыць своеасаблівым подзвігам?

Што вы разумееце пад паняццямі “чалавек,чалавечнасць?” Прадоўжыце сэнсавыя асацыяцыі да гэтых слоў. (Вучні працуюць у сшытках)

2) Пра якую памяць вядзе гаворку А.Вярцінскі ў сваім вешы? Чаму яму вельмі важна перадаць гэту памяць сваім нашчадкам? (Адказы вучняў)

**3.Мэтавызначэнне**

Часта бывае так ,што вучню хочацца апынуцца на месцы настаўніка. Сёння зноў прыйшоў такі дзень.

1)Пра што б вы прапанавалі пагаварыць сёння на ўроку?Якія задачы перад сабою паставілі б? Калі ласка, прадоўжыце выразы:

«Я паглыблю свае веды…»

«Я ўдасканалю свае ўменні...»

«Я паспрабую разабрацца ў сутнасці праблемы…»

**4.Актуалізацыя апорных ведаў, суб’ектыўнага вопыту вучняў:**

Перад вамі партрэт Я.Брыля( Івана Антонавіча Брыля). (Дэманструецца партрэт)



1)Што вам вядом пра жыццё і творчасць гэтага пісьменніка? Якія творы Я.Брыля вы чыталі ў папярэдніх класах або самастойна?

2)Чым блізкія лёсы самога пісьменніка і яго героя Даніка Мальца?

**5.Успрыманне новай тэмы**

**а) паведамленне(прэзентацыя) вучня пра жыццё і творчасць Я.Брыля:**

“Першае маленства” будучага народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля (Івана Антонавіча Брыля) прайшло ў Адэсе, дзе працаваў яго бацька-

чыгуначнік, куды ў час Першай сусветнай вайны выехала сям'я. Тут і нарадзіўся 4 жніўня 1917г. апошні з 10 дзяцей Антона Данілавіча і Анастасіі Іванаўны Брылёў – Янка. Калі хлопчыку ішоў 5 год, сям'я вярнулася на радзіму – у вёску Загора цяперашняга Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці .

Калі Янку Брылю было ўсяго шэсць з паловай гадоў, памёр бацька і маці з дзецьмі засталася адна.

Пра сваё "другое маленства" Я. Брыль расказаў у аповесці "Сірочы хлеб". У 1931г. пісьменнік скончыў у мястэчку Турэц польскую сямігодку і паступіў у Навагрудскую гімназію, але не змог вучыцца з-за цяжкага матэрыяльнага становішча.

У 1939г. юнака прызвалі ў польскую армію. Калі пачалася Другая сусветная вайна, Янка Брыль уздзельнічаў у баях пад Гдыняй, трапіў у нямецкі палон, пазней уцёк з палону і вярнуўся ў роднае Загора, якое знаходзілася пад акупацыяй.

У 1942г. Я.Брыль стаў сувязным партызанскай брыгады, а ў 1944г. – разведчыкам. У гэты час ён і пачаў пісаць свае творы.

Пасля вайны пераехаў у Мінск і стаў рэдактарам часопіса "Вожык". Першыя яго публікацыі з'явіліся ў 1938г. у часопісе "Шлях моладзі", у 1946г. выйшаў зборнік "Апавяданні".

Янка Брыль – пісьменнік шырокага дыяпазону, які пісаў апавяданні, аповесці, мініяцюры, нарысы, эсэ, раманы. Вельмі запамінальнымі з'яўляюцца яго раман пра Вялікую Айчынную вайну "Птушкі і гнёзды", дакументальная кніга "Я з вогненнай вёскі", дзе былі сабраны жудасныя ўспаміны ўцалелых жыхароў спаленых вёсак Беларусі, жорсткая і страшная праўда пра вайну і фашызм.

Творы Янкі Брыля перакладзены больш чым на 30 моў свету. Яго імя носяць вуліцы Мінска і Гдыні(Польшча).

Збор твораў пісьменніка сабраны і выдадзены ў 10 тамах.

**б)заданне для груп:**пабудова лагічных паняційных кластараў у сшытках(прыкладны ўзор )






**VI. Фізкультхвілінка**

**VII. Работа над ідэйным зместам і мастацкімі асаблівасцямі апавядання "Memento mori"**

**а)паведамленне вучня пра гісторыю напісання апавядання "Memento mori":**

У апавяданні пісьменнік звярнуўся да адной з самых трагічных старонак вайны – спальванне вёсак з людзьмі.З архіўных дакументаў да нас дайшлі звесткі аб тым,што поўнасцю,з усімі жыхарамі, было знішчана за гады вайны фашыстамі ў Беларусі 627 вёсак,з іх у Гродзенскай вобласц – 24. Сёння пра гэту найвялікшую трагедыю напамінаюць званы на мемарыяльным комплексе,узведзеным на месцы былой вёскі Хатынь на Лагойшчыне.Яны стукаюць у сэрца і памяць людзей : "Глядзі,слухай і помні !"



Сярод тысяч ахвяр,што згарэлі ў агні разам са сваімі аднавяскоўцамі, быў і сябар Я.Брыля Даніла Скварнюк( Прэзентуецца фотаздымак).



Ён і стаў правобразам галоўнага героя твора. Падзеі адбыліся на Скідальшчыне Гродзенскай вобласці. Скварнюк быў выдатным сталяром,печнікам ,вызначаўся вясёлым норавам,любіў пажартаваць.

Помсцячы насельніцтву за дзейнасць партызан,немцы і паліцэйскія вырашылі спаліць разам з жыхарамі родную вёску Данілы Скварнюка – Пузевічы. Сярод натоўпу нямецкі афіцэр пазнаў чалавека,які зрабіў яму добрую печ. Даніла Скварнюк хацеў выратаваць сваю сям'ю,аднавяскоўцаў. Гэта яму не ўдалося, і ён згарэў разам з іншымі.

Аднак галоўны герой у апавяданні адрозніваецца ад свайго прататыпа ўзростам, сямейным становішчам,сацыяльным статусам.

**г)работа над ідэйным зместам і мастацкімі асаблівасцямі твора(заданні для груп):**

Кароценькае апавяданне Я.Брыля "Memento mori",напісанае ў 1958 годзе, змяшчае ў сабе глыбокі філасофскі сэнс.Каб разабрацца ў сутнасці пытанняў і праблем ,узнятых у творы,прапануеца работа для груп у форме адказу 50 х 50(палова адказаў даецца вусна,палова пісьмова).

**І група**

1.Якімі ідэаламі і справамі жыў пячнік?

2.Вызначце ролю партрэта ў характарыстыцы старога ?

3.Якім паўстае пячнік з апошняга свайго маналога?

<u>Псіхалагічная схема вобраза печніка ў форме гексаў (узор):</u>




<u>Лесвіца “ ўзыходжання” печніка (узор выканання задання):</u>

сапраўдны герой,што здзейсніў подзвіг

цудоўны муж,бацька,дзядуля,сусед

выдатны майстар сваёй справы

звычайны селянін

**II група**

1.Якіх жыццёвых прынцыпаў прытрымліваўся зондэрфюрэр?

2.Чаму гэты “ надчалавек “ вырашыў падараваць жыццё печніку?

3.Чым тлумачыцца хуткасць дзеянняў зондэрфюрэра ў апошнія хвіліны жыцця старога печніка ?

<u>Псіхалагічная схема вобраза зондэрфюрэра ў форме гексаў (узор)</u>:




<u>Лесвіца “падзення” зондэрфюрэра ( узор выканання задання):</u>

звычайны чалавек

афіцэр нямецкай арміі

істота жорсткая і бязлітасная

звер і нелюдзь

**III група**

1.Якое месца ў апавяданні належыць перакладчыцы фройлян Веры?

2.Чаму перакладчыцу аўтар называе “істота ў скураным паліто і белай вязанай хустцы?

3.Чаму жанчына не захацела дапамагчы старому печніку і яго аднавяскоўцам?

Псіхалагічная схема вобраза перакладчыцы Веры ў форме гексаў (узор):




Лесвіца “ падзення” перакладчыцы (узор выканання задання)

звычайная дзяўчына

прыслужніца фашыстаў

нізкая істота ў інтымным плане

здрадніца Радзімы

**8. Падагульненне**

**а)слова настаўніка з элементамі гутаркі:**

1) Як вы лічыце,чаму Я Брыль не надзяліў старога печніка іменем і не назваў вёску, дзе адбываюцца падзеі?

2) Як могуць скласціся далейшыя лёсы зондэрфюрэра і фройлян Веры? Чаму?

3) Растлумачце сэнс наступных выказваняў беларускіх літаратурных крытыкаў.Да каго з герояў яны больш адносяцца? Якое з выказванняў вам больш падабаецца і чаму?

а) “Памяць пра смерць можа адводзіць ад спакусы рабіць памылкі, перасцерагчы, што не хопіць часу на адкупленне віны – жыццё кароткае”.(У.Калеснік)

б) “Чалавек не бессмяротны і павінен пакінуць па сабе добры след на зямлі, каб яго успаміналі ўдзячным словам”. (Р.Шкраба)

в) “Нягодная смерць можа перакрэсліць годнае жыццё”. (В.Каваленка)

**9. Рэфліксіўна-ацэначны этап**

**а) заключнае слова настаўніка:**

І зноў на вуліцы вясна...Пачатак мая…Самая светлая і прыгожая пара для нашых мясцін.У гэтыя дні мы зноў звяртаемся да ўспамінаў нашых ветэранаў, да архіўных дакументаў і фотаздымкаў,каб яшчэ раз напомніць усім людзям аб той трагедыі,якую прыйшлося перажыць нашым продкам. “Давайце пастараемся не дапусціць такога больш ніколі, людзі!” – аб гэтым просяць нас загінуўшыяжыхары вёсак Шавулічы, Пузевічы, Хатынь і многіх іншых вёсак і гарадоў.-Давайце заўсёды і ўсюды будзем заставацца людзьмі!”

**б)метад незакончанага сказа :**

“Дадзены ўрок паглыбіў мае веды пра…”

“Дзякуючы ўроку я ўдасканаліў(ла) уменні…”

“На ўроку я паспрабаваў(ла) разабрацца ў праблеме…і прыйшоў(ла) да высновы….”

**в) выстаўленне адзнак.**

**10.Дамашняе заданне**

Падрыхтаваць звязны аргументаваны адказ на тэму“Быць чалавекам-цяжкае прызванне,не ўсім,не кожнаму ўтрымаць яго”. (Т.Бондар) або” Якія ўражанні пакінула апавяданне Я.Брыля “Memento mori” і аб чым прымусіла задумацца?”